ПАГАДНЕННЕ
ПАМІЖ МІНІСТЭРСТВАМ ПРЫРОДНЫХ РЭСУРСАЎ І АХОВЫ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ І МІНІСТЭРСТВАМ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ СЛАВАЦКАЙ РЭСПУБЛІКІ АБ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ Ў ГАЛІНЕ АХОВЫ НАВАКОЛЬНАГА АСЯРОДДЗЯ *)

____________________________
*) Уступіла ў сілу 8 ліпеня 1997 г.

Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь і Міністэрства навакольнага асяроддзя Славацкай Рэспублікі, якія далей называюцца "Бакі",

жадаючы ўзаемна дапамагаць рэалізацыі права чалавека на здаровае навакольнае асяроддзе,

усведамляючы, што супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя з'яўляецца ўзаемавыгадным і што існуе рэальная магчымасць яго развіцця,

жадаючы садзейнічаць стварэнню больш цеснага і даўгачаснага супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя,

дамовіліся аб ніжэйпададзеным:

Артыкул 1

Бакі развіваюць супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя на прынцыпах раўнапраўнасці і ўзаемнай выгады.

Артыкул 2

Супрацоўніцтва ажыццяўляецца па наступным асноўным напрамкам:

- нарматыўна-прававое рэгуляванне дзеянняў па ахове навакольнага асяроддзя;
- удасканаленне механізму выкарыстання навакольнага асяроддзя;
- маніторынг і ацэнка ўплыву на навакольнае асяроддзе;
- сумесныя дзеянні па гарманізацыі, стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя;
- прадухіленне экалагічных аварый;
- удасканаленне метадалагічных падыходаў арганізацыі і забеспячэння экалагічнай экспертызы праектаў гаспадарчага развіцця;
- збор, перапрацоўка, рэцыклізацыя, знішчэнне, папярэдняе і канчатковае складзіраванне прамысловых, сельскагаспадарчых, бытавых і іншых адходаў і стварэнне сістэмы іх экалагічна прыдатнага выкарыстання;
- зберажэнне тэрыторый, ахова рэдкіх і знікаючых відаў жывёл і раслін;
- ахова і паляпшэнне стану навакольнага асяроддзя ў гарадах і іншых населеных месцах;
- тэхнічныя сродкі, абсталяванне і тэхналогіі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя;
- экалагічнае выхаванне і адукацыя, фарміраванне экалагічнага мыслення;
- стварэнне інфармацыйных сістэм па ахове навакольнага асяроддзя і абмен інфармацыяй у галіне навакольнага асяроддзя;
- арганізацыя ўзаемадзеяння дзяржаўных службаў аховы навакольнага асяроддзя са сродкамі масавай інфармацыі і недзяржаўнымі арганізацыямі, аналіз грамадскай думкі аб праблемах навакольнага асяроддзя;
- іншыя напрамкі супрацоўніцтва, якія Бакі будуць лічыць мэтазгоднымі.

Артыкул 3

Асноўнымі формамі супрацоўніцтва Бакоу з'яўляюцца:

- рэалізацыя сумесных праграм і праектаў па асноўным напрамкам супрацоўніцтва ў галінах, выказаных у Артыкуле 2 гэтага Пагаднення;
- арганізацыя двухбаковых парад, канферэнцый, сімпозіумаў і кансультацый;
- абмен навукова-тэхнічнай і юрыдычнай дакументацыяй, методыкамі і іншай інфармацыяй;
- стварэнне сумесных рабочых груп;
- ажыццяўленне работ на аснове пагадненняў (кантрактаў);
- іншыя формы, якія могуць вызначыць Бакі.

Артыкул 4

Для каардынацыі дзеянняў, неабходных для рэалізацыі палажэнняў гэтага Пагаднення, Бакі ствараюць Беларуска-Славацкую камісію па супрацоўніцтву ў галіне аховы навакольнага асяроддзя (далей - "Камісія").

На працягу шасці месяцаў з моманту ўступлення гэтага Пагаднення ў дзеянне Бакі паведамляюць адзін аднаму імёны прызначаных сустаршыняў Камісіі.

Камісія будзе працаваць на аснове статута, зацверджанага Бакамі на яе першым пасяджэнні.

Артыкул 5

Пры накіраванні экспертаў і іншых асоб на пасяджэнні Камісіі і для супрацоўніцтва па узгадненню праграм транспартныя выдаткі нясе бок, які накіроўвае.

Бок, які прымае, пакрывае выдаткі на пражыванне дэлегацыі боку, які накіроўвае, і выдаткі, звязаныя з паездкамі на тэрыторыі сваёй краіны пры рэалізацыі сумесных праграм.

Артыкул 6

Бакі не нясуць адказнасці па абавязацельствах арганізацый, якія супрацоўнічаюць, прынятых у адпаведнасці з пагадненнямі (кантрактамі), заключанымі на аснове гэтага Дагавору.

Артыкул 7

Інфармацыя аб выніках сумеснай дзейнасці ў рамках гэтага Пагаднення можа быць перададзена трэцім краінам, іх фізічным і юрыдычным асобам толькі па ўзаемнай згодзе Бакоў.

Артыкул 8

Спрэчкі і разнагалоссі паміж Бакамі адносна тлумачэння ці прымянення палажэнняў гэтага Пагаднення вырашаюцца шляхам кансультацый і перагавораў.

Артыкул 9

Гэтае Пагадненне не закранае правоў і абавязацельстваў Бакоў, вынікаючых з іншых міжнародных дагавароў і пагадненняў, удзельнікамі якіх з'яўляюцца Бакі.

Артыкул 10

Гэтае Пагадненне ўступае ў дзеянне з дня яго падпісання. Заключаецца на пяць гадоў, і яго дзеянне будзе аўтаматычна

працягвацца на наступныя пяцігадовыя тэрміны, калі ні адзін з Бакоў пісьмова не паведаміць па дыпламатычных каналах іншаму Боку аб сваім намеры спыніць яго дзеянне не пазней чым за шэсць месяцаў да сканчэння тэрміну дзеяння гэтага Пагаднення.

Спыненне дзеяння гэтага Дагавору не закранае дзеяння пагадненняў (кантрактаў), заключаных на аснове Пагаднення.

Здзейснена ў г.Браціславе 8 ліпеня 1997 года ў двух экзэмплярах, кожны на беларускай і славацкай мовах, прычым абодва тэксты маюць аднолькавую сілу.

За Міністэрства прыродных рэсурсаў
і аховы навакольнага асяроддзя
Рэспублікі Беларусь
Подпіс

За Міністэрства
навакольнага асяроддзя
Славацкай Рэспублікі
Подпіс